# Адчуйце подых гарадоў!

**Адкрыццё выстаўкі жывапісу «Тут быў Вася» адбудзецца сёння ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Васіль Пяшкун — адзін з нямногіх сучасных мастакоў, хто практыкуе пленэрны жывапіс. Творы аўтара — своеасаблівы дзённік назіранняў і ўражанняў.**



*«Сонечны кастрычнік». 2010 г.*

Непаўторныя каларытныя аблiччы гарадоў i краiн з лёгкай рукi мастака складаюцца ў галерэю выразных i характэрных партрэтаў. Увасабленне ў работах знайшлi адметныя мясцы, што зацiкавiлi i кранулi жывапiсца. Больш за ўсё творца натхняецца айчыннымi краявiдамi, амаль у любое надвор'е яго можна ўбачыць на вулiцах Мiнска. На палотны Васiль Пяшкун пераносiць як архiтэктурныя рысы горада, так i моманты жыцця.

Не абмiнае мастак увагай нацюрморт. Простыя рэчы i прадметы побыту: куточак майстэрнi з фарбамi i пэндзлямi, лаўка каля старога калодзежа, прылады сялянскай працы ў адрыне пад страхой, кветкi i садавiна — героi яго карцiн. Такая немудрагелiстасць сюжэтаў i кампазiцый схiляе гледача да разважанняў, дазваляе адчуць тонкае хараство i гармонiю ў будзённым i звыклым.

Творы В. Пешкуна пераносяць у мясцiны, дзе быў мастак, i ўражваюць стромкасцю гор, празрыстай чысцiнёй азёр, рытмамi вялiкiх гарадоў i павольным дыханнем вёсак.

Васiль Пяшкун нарадзiўся ў 1978 годзе ў Гомелi. Скончыў Гомельскае дзяржаўнае мастацкае вучылiшча i Беларускую дзяржаўную акадэмiю мастацтваў па спецыяльнасцi «Манументальны жывапiс». З'яўляецца стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзiдэнта Рэспублiкi Беларусь па падтрымцы таленавiтай моладзi. З 2005 года — сябра Беларускага саюза мастакоў. Удзельнiк шматлiкiх рэспублiканскiх i мiжнародных выставак. Творы жывапiсца можна пабачыць у Нацыянальным мастацкiм музеi Рэспублiкi Беларусь, Музеi сучаснага рускага мастацтва ў Джэрсi Сiцi (ЗША), прыватных калекцыях Беларусi, Расii, ЗША, Iзраiля, Японii, Iталii, Францыi ды iнш.

**Вера ЛАНКОЎСКАЯ**

РЕПОЗИТОРИЙ